

# Добрая традыцыя

***Напэўна, нікога не здзівіць той факт, што ў бібліятэцы БДУ культуры і мастацтваў наладжана цікавае культурнае жыццё, дзе не апошнюю ролю адыгрывае кіраўніцтва бібліятэкі і метадычная служба. «Кніжныя Каляды» – гэта ўжо традыцыя. Не стаў выключэннем і сёлетні год.***

Тыднёвы шэраг мерапрыемстваў адкрыла дырэктар бібліятэкі Аксана Валодзіна. Першы дзень – гэта сустрэча са слынным беларускім паэтам Казімірам Камейшам. У гэтыя дні ён адзначаў свой юбілей. Другі дзень усіх прысутных зачараваў сваім непаўторным гумарам рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя» паэт Анатоль Зэкаў. Сустрэчы адбыліся цікавыя і змястоўныя, прысутныя доўга не адпускалі пісьменнікаў, задавалі пытанні. Наступным днём на высокім прафесійным узроўні правяла лекцыю-прэзентацыю, прысвечаную жыццёваму і творчаму шляху А. Міцкевіча, старшы навуковы супрацоўнік Дома-музея паэта С. Анісімава. Мерапрыемства прайшло з нагоды 210-годдзя з дня нараджэння сусветна вядомага песняра. Далей Каляды прадоўжыліся вялікім святам «Беларускія вячоркі». Яно ўдалося на славу, па сцэнарыі ў пастаноўцы былі задзейнічаны ўсе прысутныя. Ролі ўсіх персанажаў выконвалі студэнты факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Кранулі душу цудоўным лірычным выкананнем калядных народных песень прыгожыя, абаяльныя дзяўчаты з гурта «Кроса». У апошні дзень «Кніжных Калядаў» студэнтаў, выкладчыкаў і гасцей чакала сустрэча з выканаўцамі аўтарскай песні і тэатрам «Вуліца», удзельнікі якога – студэнты факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці. На ўвесь тыдзень ад убачанага і пачутага ўсе гледачы і ўдзельнікі атрымалі вялікае задавальненне і святочны настрой.

*Таіса СУПРАНОВІЧ,*
*вядучы метадыст*
*бібліятэкі БДУКіМ*



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ